5. *Приходько О.М.* Театр кукол Украины: национальные традиции и их современное развитие: Автореф. дис. ... канд. искусствоведения: 17. 00. 01 / Акад. наук Украины. Ин-т искусствознания, фольклора и этнографии им. М. Ф. Рыльского. – Киев, 1991. – 20 с.

6. *Чалый М.К.* Воспоминания // Киевская старина. – Киев, 1889. – Т. 14. – С. 1–40.

7. *Смелянская С.А.* Украинский вертеп: к проблеме изучения истоков народного театра на Украине: Автореф. дис. ... канд. искусствоведения: 17. 00. 01 / ВНИИ искусствознания. – М., 1980. – 24 с.

8. *Цітоў В.С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэб.-метад. дапам. – Мн., 1996. – 208 с.

**Г.М.Пілевіч,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## К.Д.УШЫНСКІ АБ РОЛІ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ІДЭІ Ў ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ

К.Д.Ушынскі лічыў педагогіку вышэйшым з мастацтваў, таму што яна імкнецца да дасканаласці не на палатне, не на мармуры, а ў прыродзе чалавека.

К.Д.Ушынскі меў на ўвазе не абстрактную дасканаласць, не неакрэсленае і заўсёды адноснае паняцце прагрэсу, якое само па сабе без сапраўднай мэты і кіравання вядзе толькі да пагібелі чалавека. Ён рашуча засцерагае ад такога разумення. “З імкнення да ўдасканальвання, — піша ён, — вырастаюць і найвялікшыя дабрачыннасці, і найвялікшыя заганы. Новыя пакаленні з’яўляюцца на свет Божы, растуць, патрабуюць ад нас выхавання, а выхаванне патрабуе пэўнай накіраванасці, мэты пераканання”. Якім шляхам весці чалавека да дасканаласці? К.Д.Ушынскі адказвае на гэтае пытанне з уласцівай яму яснасцю і дакладнасцю: “Толькі хрысціянства можа весці чалавека па гэтай вялікай і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

небяспечнай дарозе, указваючы на жывы ідэал дасканаласці — Хрыста". "Для нас, — лічыў К.Д.Ушынскі, — нехрысціянская педагогіка — рэч немагчымая, справа без заахвочвання ў мінулым і без выніку ў будучым. Усё, чым чалавек як чалавек можа і павінен быць, выказана цалкам у божым вучэнні, і выхаванню застаецца толькі ў аснову ўсяго палажыць вечныя ісціны хрысціянства. Яно служыць крыніцай усялякага свету і ўсялякай праўды і ўказвае вышэйшую мэту выхавання. Гэта нязгасны светач, што ідзе вечна, як вогненны стоўп у пустыні, — наперадзе чалавека і народаў", бо хрысціянская мараль ёсць у духоўным сэнсе арыстакратычная, а не рабская мараль, мараль моцных духам, а не слабых, што здзяйсняюць насілле і прыгнёт над чалавекам. Хрысціянская свабода заснавана на пазнанні ісціны і падпарадкаванні сябе ёй: "Пазнайце Ісціну, і Ісціна зробіць вас вольнымі". Адсюль задача выхавання — засцерагаючы прыроджанае імкненне дзіцяці да свабоды развіцця сваёй асобы, весці яго да вышэйшай свабоды, якая заключаецца ў добраахвотным падпарадкаванні сябе Ісціне.

У аснову ўсёй сістэмы выхавання павінен быць пакладзены маральна-рэлігійны пачатак, без якога немагчыма сфарміраваць духоўна-маральную, свабодную асобу. Сёння, калі адхіляюцца інтэрнацыяналісцкія каштоўнасці, а новых мы пакуль не набылі, ці не трэба нам з верай, надзеяй і любоўю звярнуцца да праваслаўна-хрысціянскай традыцыі, суаднесці яе па меры магчымага з тымі абставінамі, з якімі непазбежна сутыкнуцца наш педагог і сям'я ў трэцім тысячагоддзі?

Галоўнае месца ў такім выхаванні павінна займаць сям'я — першы натуральны свяшчэнны саюз, які будуецца на каханні, веры, надзеі і свабодзе. Чалавек вучыцца ў ім першым сумесным рухам сэрца, падымаецца ад яго да далейшых формаў духоўнага яднання — Радзімы і Дзяржавы. Сям'я — складаючая і рашаючая частка адукацыі, і разам з тым яна не можа замяніць школу. Галоўная задача сям'і заключаецца ў далучэнні дзіцяці да ўсіх сфер духоўнага вопыту з тым, каб яго ўспрымальнае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сэрца навучылася адклікацца на ўсялякія з'явы свету і ўчынкі людзей.

У пачатку XX ст. актывізаваўся працэс разбурэння рэлігійна-маральных асноў сямейнага выхавання. Адсутнасць такога выхавання прывяла да росту злачыннасці, наркаманіі, СНІДу і садызму, дзе дзейнічае групавая мараль без апоры на духоўнасць.

Не выпадкова сёння ўсё часцей ставіцца пытанне аб адраджэнні рэлігійна-маральных асноў сямейнага выхавання, таму што сям'я — гэта наследніца маральных і духоўных звычак і каштоўнасцей, створаных дзедамі і прадзедамі. У нашых нашчадкаў рэлігійнае выхаванне пачыналася з самага ранняга дзяцінства і адпавядала глыбокім запатрабаванням дзіцячай душы.

Калі дух у сэрцы дзіцяці будзе абуджаны, то дзіця адолее ўсе цяжкасці і спакусы ў будучым. І ў цяжкія моманты свайго жыцця дзіця будзе звяртацца да заступніцтва Божай Маці, Ісуса Хрыста. У сем—восем гадоў хлопчыкі ўжо могуць прымаць удзел у богаслужэнні — выходзіць са свечкай, падаваць запіскі, запальваць свечкі, дзяўчынкі — удзельнічаць у хоры.

Вялікую ролю ў рэлігійна-маральным выхаванні дзіцяці мае маці. Даглядаючы за дзіцем, сочачы за яго першымі гульнямі, навучаючы яго вымаўляць першыя словы і першую малітву, маці закладвае краевугольны камень, яна робіцца галоўным дойлідам грамадства. Маці павінна ведаць і ясна ўяўляць глыбокі сэнс Апакаліпсіса, каб даступна перадаць яго сэнс. Дзіця надзвычай лёгка разумее, што такое любоў да бліжняга, што такое бессмяротнасць душы. Маці можа навучыць дзяцей пазнаваць і любіць Бога па яго тварэннях, што акружаюць дзіця. Яна зверне ўвагу дзіцяці на зоркі, на захад сонца, на змену дня і ночы, зімы і лета. Нішто так не навучыць любіць Бога, як сузіранне спраў Яго ў Сусвеце.

Шчасце быць выхаваным у першыя гады дзяцінства маці, якая разумее святасць свайго прызвання!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У свеце ёсць цудоўныя спалучэнні колераў. Трэба паказаць іх дзіцяці. У свеце ёсць дзівосныя святлацені, захапіўшыя калісьці Леанарда да Вінчы, венецыянцаў, Рэмбранта.

Ёсць простыя і пяшчотныя мелодыі. Іх шмат у нашых народных песнях, калыханках, вясельных, карагодных песнях, якія дзіця павінна палюбіць яшчэ ў калысцы. Маці, спяваючы іх свайму дзіцяці, пачынае яго сапраўднае выхаванне. Якія цудоўныя калыханкі былі абуджаны гэтым спяваннем у дзіцячай душы і потым вернуты свету ў творах вялікіх музыкантаў!

Задача маральнага выхавання ў дзіцячым узросце заключаецца ў тым, каб добрыя інстынкты дзіцячай натурыператварыць у свядомае імкненне да дабра, духоўнай красы і праўды. “Для непасрэднага маральнага выхавання чалавека... Евангелле — адзіная і найбольш дасканалая крыніца маральнасці, якая дае жывы вобраз дасканаласці ў асобе Хрыста-Спасіцеля”, — сцвярджае К.Д.Ушынскі.

Вось тая атмасфера, у якой павінна выхоўвацца хрысціянскае дзіця. І галоўная задача такога выхавання — не ў стварэнні “інтэлекту”, а ў развіцці душы і натхненні сэрца, таму што ўзбагачаная памяць пры мёртвай і неразвітой душы робіць спрытнага, але чэрствага і злога чалавека. Вось чаму адукацыя без выхавання ёсць справа памылковая і небяспечная. Яна робіць часцей за ўсё людзей паўадукаваных, ганарлівых і фанабэрыстых, бессаромных кар’ерыстаў, падтрымлівае ў чалавеку ваўка.

Як бачна, філасофскай асновай усёй педагагічнай сістэмы К.Д.Ушынскага, компасам на цяжкім шляху яго жыцця, яго пошукаў у галіне тэорыі і практыкі выхавання была хрысціянская ідэя.

Працы К.Д.Ушынскага — гэта сапраўдная педагічная энцыклапедыя, якая не страціла сваёй актуальнасці ў нашы дні і з’яўляецца, як і раней, настольнай кнігай для настаўнікаў і бацькоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ